Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

29 жніўня 2018 года
Серада

№64 (10785)

УРАДЖАЙ-2018

# Грэчка – культура не лішняя



**І пасля завяршэння асноўнай фазы жніва тэхніка па-ранейшаму ў полі. Разгортваецца ўборка грэчкі. У раёне яна займае больш за 500 гектараў. У "Кругаўцы", "Жгунскім" і "Крупцы" работы ўжо распачалі.**

Накіроўваемся на палетак сельгаспрадпрыемства "Кругавец". Сёлета пад грэчку тут адвялі больш за 60 гектараў. Плошчы – немалыя для адной гаспадаркі.

Пры ўсіх перавагах вырошчвання царыцай палеткаў грэчка пакуль не з'яўляецца. Прычына – меншая ў параўнанні з іншымі зерневымі ўраджайнасць: у сярэднім па раёне – 13,6 цэнтнера з гектара.

Каштоўная зерневая культура – у чаканні ўборачнай тэхнікі. Праўда, адразу гэтага і не скажаш: над белымі кветкамі меданосу актыўна кружаць пчолы.

– У гэтым і ёсць хітрасць пры яе вырошчванні, – заўважае галоўны аграном сельгаспрадпрыемства Сяргей Рудзянкоў **(на здымку)**. – Новыя кветкі не паспеюць стаць зернем. Затое калі прамарудзіш, можна страціць ужо сфарміраваны ўраджай. Зярняты асыпаюцца імгненна.

Пясчаныя глебы "Кругаўца" – не самыя спрыяльныя для вырошчвання культуры. Аднак, упэўнены спецыяліст, захаваўшы тэхналогію, можна разлічваць на добры ўраджай. Сёлета, напрыклад, у гаспадарцы мяркуюць атрымаць каля 18 цэнтнераў з гектара.

– Пад грэчку некаторыя ўгнаенні патрэбна ўносіць з восені. Зробіш гэта несвоечасова – на палеткі не прыляціць пчала. Сёлета з пасевамі вызначыліся ў апошні момант, таму абышліся без угнаенняў. Толькі для грэчкі – гэта не галоўнае, – распавядае аграном. – Убіраць яе павінен самы вопытны камбайнер.

З грэчкай Сяргей Рудзянкоў мае справу больш за 30 год. Жартуе, любіць яе не толькі на талерцы. Некаторыя калегі кансультуюцца ў яго сакрэтамі ўборкі зерневай культуры.

Дарэчы, у засекі гаспадаркі ўжо засыпана насенне пад ураджай будучага года.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### З падарункам ад Фонду міру

300 рублёў на падрыхтоўку дзяцей да новага навучальнага года выдзеліла абласное аддзяленне Беларускага фонду міру раённаму сацыяльна-педагагічнаму цэнтру. Чакаецца, што траім выхаванцам прытулку СПЦ рукзакі з прыналежнасцямі будуць уручаны ў зале, дзе адбудзецца жнівеньскі педсавет. Для аднаго з рабят школьны званок празвініць упершыню.

Як адзначыў старшыня абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Цімафей Глушакоў, у грамадскай арганізацыі стараюцца дапамагчы дзецям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Вось і ў гэты раз 9 жыхароў Гомельшчыны пойдуць у школу з падарункамі ад Беларускага фонду міру. На набыццё вучнёўскіх прылад арганізацыяй выдзелена каля тысячы рублёў.

**Таццяна АХРАМЕНКА**

### Вучыцца бяспечна

**Супрацоўнікі МНС разам са спецыялістамі Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы» распрацавалі дызайн вокладкі школьных сшыткаў.**

На ёй будуць друкавацца правілы бяспечных паводзін.

– Ілюстрацыя распрацавана непасрэдна на прадпрыемстве пры ўдзеле выратавальнікаў, – расказаў намеснік дырэктара прадпрыемства па вытворчасці Ромас Радзевіч. – Сшыткі з'явяцца ў продажы прыкладна ў кастрычніку гэтага года.

**Раман ТАРАСЕВІЧ**

### І якасць, і асартымент

**Аддзел кааператыўнай прамысловасці райспажыўтаварыства заключыў дамовы на пастаўкі прадукцыі ў прыватныя гандлёвыя кропкі раёна, у тым ліку – гандлёвую сетку кампаніі "Еўрагандаль".**

Выпуск і продаж хлебабулачных вырабаў нарошчваюць Цэрахоўскія хлебапёкі. Штодзённая вытворчасць іх складае 9 тон, кандытарскіх вырабаў – да 500 кілаграмаў.

Найбольшым попытам у спажыўцоў карыстаюцца формавы хлеб "Юбілейны" і "Абедзенны", новыя сарты подавага хлеба "Віта" і "Картузіянскі".

**Леанід МІНІЧ**

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 13.55
Луна
29, 30 августа — в Овне,
31 августа — в Тельце



Полнолуние

**30 августа**
НОЧЬЮ +11…+13
ДНЕМ +21…+23
Ясно.
Без осадков.
Ветер западный, 1-3 м/с

**31 августа**
НОЧЬЮ +14…+15
ДНЕМ +22…+24
Ясно.
Без осадков.
Ветер ю-западный, 1-2 м/с

ИНТЕРВЬЮ ДЛЯ ЗНАКОМСТВА

# Один в поле не воин

*Валентина Кривенкова исполняет обязанности председателя Перероstовского сельсовета всего несколько недель. Сразу окунулась в круговерть забот: удаление аварийных деревьев, окоска территории, посещение граждан со смотровой комиссией...*

*Тяжело ли быть в ответе за состояние пяти немалых населенных пунктов, какие вопросы и проблемы для сельчан сегодня наиболее актуальны, она рассказала в интервью «ДК».*



**– Человек в районе Вы неновый, да и обязанности руководителя сельисполкома Вам, хоть и косвенно, но знакомы.**

– Приходилось решать вопросы благоустройства во время работы в землеустроительной службе, отделах жилищно-коммунального хозяйства райисполкома, архитектуры и строительства.

Неплохой опыт организаторской работы приобрела в районном комитете прежнего Белорусского патриотического союза молодежи. Многие бывшие активисты организации сегодня трудятся в разных сферах, и с ними просто находить контакт. Надеюсь, это поможет в моей работе.

**– Задач перед местной исполнительной властью стоит много. Которые из них, на Ваш взгляд, приоритетные?**

– Сегодня остро стоят три вопроса: благоустройства населенных пунктов, захоронение ветхого жилья и работа смотровых комиссий.

Продолжаем окашивать улицы населенных пунктов. Сделать это оперативно не получается – работает всего одна мотокоса и один косец. Неудобство и в том, что в штате сельисполкома нет должности рабочего. Приходится на сезон нанимать человека по договору подряда. Надеюсь на помощь со стороны директора сельхозпредприятия «Калининский».

По захоронению пустующих домов также немало работы. Выявлено более 10 таких домовладений. Сейчас необходимо подготовить документы для передачи их в суд. Определенное время займет поиск потенциальных наследников и переговоры с ними. Обидеть людей, принимая окончательное решение, недопустимо.

**– Новое место работы – поиск единомышленников и бескорыстных помощников. Как обстоят дела с этим у Вас?**

– Совет – не то место, где можно обложиться бумагами и раздавать указания подчиненным. В первую очередь, нужно наладить взаимодействие со всеми предприятиями и организациями, расположенными на его территории. Без помощи местного хозяйства, школы, ФАПа, сельского Дома культуры и библиотеки выполнить большинство задач силами штатных работников невозможно.

Уже провели первый выезд смотровой комиссии и посетили часть адресов сельчан из группы риска. Большинство членов комиссии – давно знакомые люди. Обговорили с ними дальнейшие планы. Сейчас актуальны ремонт печей и обеспечение одиноких и одиноко проживающих пенсионеров автономными пожарными извещателями. Думаю, совместно решим эти проблемы.

Наладилось хорошее взаимодействие с коммунальной службой. В первый день в новой должности ко мне обратилась одна из жительниц Перероста с просьбой удалить аварийные деревья возле ее дома. По моей просьбе представители «Добрушского коммунальника» оперативно отреагировали и спилили опасные насаждения. Такие же деревья обнаружились и на местном кладбище. И снова коммунальщики не отказали.

**Сергей ЧАЙДАК**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

НА СВЯЗИ

**1 сентября с 9.00 до 12.00 по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Сергей Викторович ПЕТРОВСКИЙ, заместитель председателя райисполкома.

* * *

**30 августа с 11.00 до 12.00 по телефону 3-12-48**
пройдет прямая телефонная линия с участием Владислава Гисматовича ГАСЫМОВА, начальника районного отдела внутренних дел.

* * *

**31 августа с 12.00 до 13.00**
в Комитете государственного контроля Гомельской области пройдет прямая телефонная линия по вопросам обеспеченности сельскохозяйственных организаций Гомельской области кадрами, полноты предоставления льгот молодым специалистам, обеспечения жильем.
Телефон прямой линии в Гомеле: **8(0232) 23-83-73.**

В СТРАНЕ

## Готовность – высокая

**Все школы готовы к началу учебного года. Об этом сообщила заместитель начальника главного управления общего среднего, дошкольного и специального образования – начальник управления общего среднего образования Министерства образования Ирина Каржова.**

«Могу констатировать с уверенностью, что учреждения общего среднего образования готовы к началу учебного года, – сказала она. – Местные распорядительные органы создали комиссии, которые мониторят готовность учреждений образования к началу учебного года. При приемке в первую очередь обращается внимание на создание безопасных условий при организации образовательного процесса, обеспеченность педагогическими кадрами, учебно-методической литературой.

По словам представителя Минобразования, в 2018-2019 учебном году планируется, что будут функционировать 3038 учреждений общего среднего образования. К занятиям приступят около 1,1 млн учащихся. «В том числе мы ожидаем, что за парты сядут 110 тысяч первоклассников. К 1 сентября будут открыты 3 новых учреждения общего среднего образования. Одно из них – в Минске на 1020 учащихся, одно – в Бобруйске на то же число, а также в деревне Лесковка Минского района – на 720 учеников, – сообщила Ирина Каржова. – В учебном году будет организован подвоз к месту обучения около 72,3 тыс. учащихся. Будут использоваться более 1,5 тыс. школьных автобусов». На этот год запланировано издание 56 учебных пособий, из которых – 44 новых, а 12 – переиздание.

## Эффективность контроля за ценами повысится

**Механизм обязательной регистрации предельных отпускных цен производителей на лекарства позволит повысить эффективность системы контроля за формированием цен на препараты.**

Такое мнение высказала начальник управления фармацевтической инспекции и организации лекарственного обеспечения Минздрава Людмила Реутская. Сейчас в Беларуси по закону о лекарственных средствах заявитель при регистрации препаратов в досье указывает заявленную цену, которая является предельной отпускной ценой лекарственного средства. Однако методика определения этой цены нормативными документами не установлена. В соответствии с указом №345, предлагаемая заявителем цена будет подвергаться экономическому анализу.

В соответствии с указом создается прозрачный и понятный всем участникам рынка механизм регулирования цен. Положения документа распространяются на 37 международных непатентованных наименований лекарств: 21 – для лечения сердечно-сосудистых и 16 – для онкологических заболеваний.

**По материалам БелТА**

ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА-2018

# Дзякуй – за стараннасць



**У Добрушы завершылі працу студэнцкія працоўныя атрады. Апошнія дзесяць дзён старшакласнікі і студэнты клапаціліся пра добраўпарадкаванне гарадскіх вуліц, выконвалі шэраг іншых работ. Для многіх рабят працоўнае лета-2018 было не першым.**

У апошні працоўны дзень намеснік генеральнага дырэктара "Добрушскага камунальніка" Ала Белкіна і галоўны спецыяліст райкама БРСМ Вольга Мельнікава павіншавалі рабят з заканчэннем працоўнага семестра і выказалі спадзяванне на сустрэчу ў наступным годзе. Кожнаму з рабят прадстаўнік маладзёжнай арганізацыі ўручыла невялікія сувеніры **(на здымку)**. А для Ягора Драбышэўскага візіт арганізатараў працоўнага семестра стаў прыемнай нечаканасцю.

– Стараннасць маладога чалавека адзначылі ўсе майстры, з якімі рабятам даводзілася працаваць. Сумленнае стаўленне да працы дастойна самай шчырай удзячнасці, – адзначыла Ала Белкіна.

Прадстаўнік арганізацыі-наймальніка ўручыла падзячны ліст ад адміністрацыі "Добрушскага камунальніка" за дастойнае выхаванне сына бацькам Ягора Кацярыне Анатольеўне і Уладзіміру Ігнацьевічу.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота аўтара**

НОВОСТИ РЕГИОНА

## Стартовал месячник по заготовке кормов

**Месячник по заготовке кормов объявлен в Гомельской области, сообщил на аппаратном совещании председатель облисполкома Владимир Дворник.**

Аграрии региона набирают темпы уборки кукурузы на силос. В целом предстоит заготовить свыше 4,1 миллиона тонн силоса, практически весь он будет из кукурузы. Как рассказали в комитете по сельскому хозяйству и продовольствию облисполкома, уже заготовлено 354,8 тысяч тонн силоса при средней урожайности зеленой массы 241 центнер с гектара.

На особом контроле – качество заготовки кормов как в процессе уборки (степень измельчения, зрелость убираемой кукурузы), так и при закладке в силосно-сенажные траншеи.

Губернатор поставил задачу в течение месячника уделить должное внимание теме заготовки кормов всем заинтересованным службам.

**По материалам СМИ**

## Вниманию населения!

Управление по труду, занятости и социальной защите Добрушского райисполкома информирует, что в связи с заменой программного обеспечения информационно-вычислительной системы государственной службы занятости в период с 30 августа 2018 года по 3 сентября 2018 года не будут предоставляться все виды услуг в области занятости населения.